«ПРЫЕХАЛА КАЛЯДА НА БЕЛЫМ КАНІ»



Па гарызанталі: 1. «Хай ... родзіць,\\Хай чарка ходзіць,\\Хай патэльня трашчыць,\\На ёй скварка пішчыць». Каляднае пажаданне. **4.** «Не баяцца госці — ...\\тых, хто робіць ім кармушкі». З верша М.Сазончыка «Госці». **9.** «Ой, па мосціку, па залатому, Каляда, Каляда !\\Ой, стучаць, бяжаць ..., Каляда, Каляда!». З каляднай песні. **10.** Аптычны прыбор. **11.** На Беларусі ў даўнія часы грашовы аброк. **13.** Шаўковая тканіна з разводамі, якія пераліваюцца рознымі адценнямі. **14.** «Дзе ... рогам,\\Там жыта стогам.\\Дзе ... ступіць,\\Там яно кусціць». З каляднай песні. **15.** «Да я Каляду да на кут павяду,\\Ой, ..., ..., да на кут павяду». З каляднай песні. **16.** Паганяты сабак або аленяў, запрэжаных у нарты. 17. «Зноў ... паслала\\снежныя кілімы». З паэмы П.Труса «Дзясяты падмурак». **19.** Горад на поўначы Аўстрыі, порт на рацэ Дунай. **20.** Калі напярэдадні Каляд неба зорнае — будуць несціся ...(прыкм.). **21.** «... , барджэй, барджэй, а нам Піліпаўка надакучыла». З каляднай песні. **26.** Зімовае ... .Перыяд часу з мінімальнай вышынёй Сонца над гарызонтам (21-23 снежня). **27.** Урачыстасць, прысвечаная гадавіне якой-небудзь падзеі. **28.** Тое, што клалі пад абрус падчас каляднай вячэры.

Па вертыкалі: 2. Завітыя кольцамі пасмы валасоў. **3.** «Чым там у лесе жыве хата,\\Як там рыхтуюцца да ...\\І як калядкі сустракаюць». З паэмы Я.Коласа «Новая зямля.» («Каляды»). **5.** Прылада для клеймавання жывёлы. **6.** Вялікая колькасць чаго-небудзь сыпкага. **7.** «Прыехала Каляда на белым кані,\\Яе ... — ясен месячык,\\Яе дружачка — ясна зорачка». З каляднай песні. **8.** «..., марозна,\\Забірае дрож». З верша Я.Купалы «Зімовая ноч». **12.** Свята з карагодамі і песнямі, якое на Беларусі пачыналі адзначаць напярэдадні 1 студзеня і працягвалі да трэцяй куцці. **13.** «Нядзеля. ... калядны.\\У хаце ўсё ладна». З верша А.Пісьмянкова «Нядзеля». **16.** На Каляды — ..., на Вялікадня — сыр, а ўсё чалавек сыт (прык.). **18.** Штучна выкліканае хваляванне, узбуджэнне. **22.** Ізаляваная ад іншых частка спецыяльнага памяшкання на караблі, самалёце. **23.** Паясная папруга. **24.** Прыстасаванне для далучэння правадоў да машыны, прыбора. **25.** «Дзякуй Богу, добры ... ідзе,\\Шчодры вечар Каляду вядзе». З верша Х. Жычкі «Шчодры вечар».

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ, *г. Дзяржынск.*

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:

Па гарызанталі: 1. Бульба. 4. Птушкі. 9. Калядоўнікі. 10. Мікраскоп. 11. Чынш. 13. Муар. 14. Каза. 15. Рана. 16. Каюр. 17. Зіма. 19. Лінц. 20. Куры. 21. Калядачкі. 26. Сонцастаянне. 27. Угодкі. 28. Салома.

Па вертыкалі: 2. Буклі. 3. Свята. 5. Таўро. 6. Куча. 7. Конічак. 8. Сіверна. 12. Шчадрэц. 13. Марозік. 16. Кілбаса. 18. Ажыятаж. 22. Адсек. 23. Дзяга. 24. Клема. 25. Снег.

■ Ведай нашых!

...А ПЕРАМОГ — БЫХАЎЧАНІН

Спявак з Магілёўшчыны Сяргей Ваўчкоў перамог у тэлевізійным шоу «Голас-2»

Галоўная інтрыга шоу на Першым канале Расіі, якое доўжылася 4 месяцы і ўдзел у якім прымала не адна тысяча спевакоў, раскрытая. Яго пераможца — наш зямляк з Быхава. Адной з трох кампазіцый, якія прагучалі ў яго выкананні, стала тая самая арыя містара Ікс, што так кранула Аляксандра Градскага падчас «сляпога праслухоўвання» і заахвоціла забраць Сяргея ў сваю каманду. У фінальным паядынку сапернікамі спявака былі самыя моцныя выканаўцы — Ціна Кузняцова, Гела Гуралія, Наргіз Закірава. Але за Сяргея свае галасы аддалі 75% (!) слухачоў. Такога нават спявак не чакаў.

— Мы атрымалі аж 600 SMS-паведамленняў, — адзначыў яго брат Уладзімір Ваўчкоў. Падчас выступлення Сяргея ён быў яго прамоўтарам у Быхаве, ствараў масоўку для падтрымкі брата ў Маскве — **Аўт.)** — Пісалі нават з Францыі і Кітая. Калі б у беларусаў была магчымасць прымаць удзел, галасоў, думаю, было б нашмат больш. Калі чытаў словы прызнанняў у сацсетках, душа радавалася. Гэта не першы поспех брата. Ён быў лаўрэатам 1-ай прэміі міжнароднага конкурсу «Рамансіяда», займаў прызавыя месцы ў міжнародных конкурсах у Польшчы і Германіі. Але менавіта гэты праект зрабіў яго вядомым. Усім вялікі дзякуй за падтрымку. На праекце Сяргея назвалі галоўным голасам краіны. Сваім выкананнем ён заваяваў сэрцы расіян.

У якасці прыза Сяргей Ваўчкоў атрымаў кантракт з самай славутай у Еўропе гуказапісвальнай кампаніяй Universal Music. Дарэчы, калісьці бацькі прадказвалі свайму таленавітаму сыну кар'еру юрыста. Яны казалі: музыка — гэта не прафесія, не трэба аддаваць сябе на жабрацкае існаванне. Але мара перамагла. Некалькі гадоў назад Сяргей кінуў усё і пераехаў у Маскву. Цяпер ён студэнт інстытута тэатральнага мастацтва. А на праекце, акрамя іншых сваякоў, яго падтрымлівала каханая жонка Наталля. Для яе перамога Сяргея таксама стала вялікім падарункам.

Пасля таго, як бацькі спевака вярнуліся з Масквы, дзе яны разам з Сяргеем прымалі ўдзел у здымках праграмы Андрэя Малахава, іх запрасілі на навагодні прыём да старшыні Быхаўскага райвыканкама Дзмітрыя Калеева. Ён выказаў удзячнасць за выхаванне таленавітага сына і разам з падарункамі ўручыў кветкі і падзячны ліст.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

■ Інфарм-укол

Падыхаць цыбулькай, пажаваць часначку

Каб арганізм змог самастойна перамагчы любую рэспіраторную нагрузку, патрабуецца правільна арганізаваць сваю жыццёвую прастору — наладзіць жыццё такім чынам, каб кожны дзень спрыяў умацаванню здароўя. Не злоўжываць алкаголем і не курыць будзе недастаткова. Неабходна яшчэ рацыянальна харчавацца, сістэматычна займацца фізкультурай, загартоўвацца. Існуе, вядома, і спецыяльная прафілактыка прастудных захворванняў і грыпу, нагадвае загадчыца аддзялення медыцынскай рэабілітацыі 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Анфіса ШАПАВАЛАВА.

Аксалінавая мазь (або яе аналагі). Не мае проціпаказанняў ні ў дарослых, ні ў дзяцей. Трэба наносіць на слізістую носа адзін-два разы ў дзень. Можна непасрэдна ў час пад'ёму захваральнасці, а можна і ўвогуле ў халодны час года. Акрамя таго, двойчы на дзень неабходна мыць насавыя пазухі мылам, каб выдаліць вірусы і бактэрыі, якія трапілі ў іх з паветрам.

Імунамадулятары. Адаптагены расліннага паходжання (настойка араліі, экстракт элеўтэракоку, настойка і экстракт жэньшэню, прэпараты эхінацэі). Яны «падсілкоўваюць» імунітэт, аднак перад прымяненнем лепш удакладніць ва ўрача, наколькі гэта патрэбна менавіта вам.

Абсалютна ўсім паказаны прагулкі на свежым паветры, праветрыванне памяшканняў, пазбяганне пераахалоджвання, стрэсавых сітуацый.

Трэба мыць рукі! Вірусы вельмі лёгка пераходзяць з рук хворых людзей на рукі здаровых, а адтуль — у нос, рот, вочы. Асабліва часта трэба мыць рукі, калі даглядаеш хворага дома. У такім выпадку варта яшчэ насіць маску, вылучаць хвораму асобны посуд, рушнік і г.д.

Штодня рэкамендуецца ўжываць **2-3 зубкі часнаку** — жаваць іх некалькі хвілін, каб поўнасцю ачысціць ротавую поласць ад бактэрый. Аднак можна і проста 10-15 хвілін дыхаць парамі свежапрацёртай цыбулі або часнаку.

Існуе і такі народны рэцэпт: дадаць у сок алоэ мёд і сухое віно, настояць 5 дзён, прымаць па 1 ч.л. перад ежай.

Штодня неабходна ўжываць свежыя садавіну і гародніну.

У якасці і прафілактыкі, і лячэння можна прапанаваць і некаторыя іншыя сродкі.

Прамыванне носа

✓ Настойка цыбулі з мёдам (або цукрам). 3 ст. л. здробненай цыбулі, 50 мл цёплай вады, 1/2 ч. л. мёду (цукру) — настояць 30 хвілін. Закапаць піпеткай.

✓ Масляны настой часнаку з цыбуляй. Алей вытрымаць у шкляным посудзе ў посудзе з вадой, якая кіпіць (на «паравой лазні») 30-40 хвілін. Заліць ім здробненыя 3-4 зубкі часнаку і 1/4 цыбулі. Настояць 2 гадзіны, працадзіць.

Інгаляцыя

У гатаваную ваду дадаць 30-40 кропель настойкі эўкаліпту або 1/2 ч. л. соды.

Нажная ванна

1 ст. л. сухой гарчыцы — на 6-8 л вады. Вада павінна быць досыць гарачай. Ухутаныя пледам ногі трымаць 15-20 хвілін. Пасля расцерці сагравальнай маззю.

Для ротавай поласці

Пажаваць кавалачак прапалісу 15-20 хвілін.

Для носа

Раніцай і перад сном закапаць нос сокам алоэ, змешаным напалову са стэрылізаваным алеем — па 1-2 кроплі ў кожны насавы ход. Падчас павышэння захваральнасці можна спалучаць гэта з ужываннем унутр спіртавой настойкі прапалісу, растворанай у 30-50 мл вады. Ужываць з разліку 1 кропля на 1 год жыцця.

Як правільна паласкаць горла?

Вада для паласканняў не павінна быць ні гарачай, ні халоднай. Гарачай можна пашкодзіць слізістую, а ад халоднай не будзе карысці. Галаву неабходна закінуць назад, язык выцягнуць наперад, каб раствор трапіў на корань языка. Кожны прыём паласкання павінен працягвацца не менш за 30 секунд.

Штораз для працэдуры трэба гатаваць свежы раствор. Глытаць раствор нельга.

Паласкаць ад 5 да 10 разоў на дзень пасля ежы. Нічога пасля не ўжываць на працягу гадзіны.

✓ Паласкаць горла можна растворамі марганцоўкі, фурацыліну, соды, рамонку, а таксама салявым растворам.

✓ Растварыце лімонны сок у шклянцы вады. Лімонная кіслата забівае бактэрыі, звязвае і выводзіць макроту.

✓ Развядзіце ў гарачай вадзе роўныя часткі мёду і перацёртага імбіру. Дадайце некалькі кропель лімоннага соку. Паласкаць горла гэтым саставам варта перад сном.

✓ 1 ст. л. лупіння цыбулі заліць шклянкай гарачай вады, пракіпяціць, пакінуць на 3 гадзіны. Адвар працадзіць, паласкаць горла на працягу дня.

✓ На шклянку вады — 1 ч. л. соды, 3-4 кроплі ёду, 1/4 ч. л. солі. Паласкаць да 10 разоў на дзень.

✓ У шклянку бурачнага соку дадаць 1 ст. л. воцату. Паласкаць 5-6 разоў на дзень.

✓ У 1/2 шклянкі маркоўнага соку дадаць 1 ст. л. мёду, развесці вадой. Паласкаць 5-6 разоў на дзень.

✓ Сок кораня хрэну разбавіць гатаванай вадой 1:1.

✓ Ліст каланхоэ вымыць, здрабніць, прапусціць сок праз марлю, змяшаць у роўнай долі з вадой.

✓ 1 ч. л. лыжку настойкі календулы, або прапалісу, або рамонку, або зверабою, або інш. растварыць у шклянцы цёплай вады. Паласкаць некалькі разоў на дзень.

✓ 1 ст. л. сумесі сухіх траў — рамонку, эўкаліпту, календулы заліць шклянкай кіпеню. Настояць, працадзіць (або прыгатаваць на паравой лазні).

✓ Дадаць у шклянку вады 10-15 кропель алею шалфею, чайнага дрэва, эўкаліпту, піхты.

✓ 1 ч. л. лыжка шалфею, 1/4 шклянкі карычневага цукру, узяць 3/8 шклянкі сталовага воцату і 1/8 вады.

Кампрэс для горла

Можна змяшаць гарэлку і ваду ў прапорцыі 1:2. Зверху горла абматаць цёплым шалікам.

Пітны рэжым

Паболей піце цёплага — чаю з малінавым варэннем, або мёдам (вада павінна мець тэмпературу ніжэй за 60 градусаў), або лімонам, шыпшынай, ці морсаў з замарожаных ягад.

Харчовы рэжым

Падчас хваробы нельга перагружаць арганізм тлустым мясам, салодкім і мучным. Трэба перайсці на малочныя прадукты, кашу з грэцкіх круп, поснае курынае мяса, курыны булён, тушаную гародніну.

Святлана БАРЫСЕНКА

Даты | Падзеі | Людзі

1890 год — нарадзіўся Карэл Чапэк, чэшскі пісьменнік. Адзін з ідэолагаў незалежнасці Чэхаславацкай рэспублікі, пісьменнік з сусветным іменем, фантаст і сатырык. Актыўная грамадзянская пазіцыя пісьменніка вызначыла і кірунак яго літаратурнай творчасці, якая была прасякнута нянавісцю да фашызму. Драмы Чапека «Белая хвароба», «Маці», раман «Вайна з саламандрамі» ярка раскрываюць антычалавечую сутнасць ідэалогіі «белай расы». Звярнуўшыся да актуальных грамадскіх праблем, чэшскі пісьменнік стаў таксама адным з самых вядомых аўтараў сацыяльнай фантастыкі.

1909 год — 105 гадоў таму нарадзілася (вёска Серкавіцы, цяпер Талачынскі раён) Марыя Барысаўна Осіпава, удзельніца Мінскага антыфашысцкага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Мінскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1943). У вайну стварыла ў Мінску падпольную групу, была сувязной партызанскіх атрадаў Нікіціна , «Дзімы», «Мясцовыя», брыгады «Дзядзькі Колі». Арганізоўвала выратаванне, забеспячэнне дакументамі і адпраўку ў партызанскія атрады савецкіх ваеннапалонных, вязняў гета, дастаўку партызанам зброі і боепрыпасаў. Адна з арганізатараў знішчэння фашысцкага генеральнага камісара Беларусі В. Кубэ ў верасні 1943 года. Памерла ў 1999 годзе.

1945 год — нарадзіўся (вёска Каменка Нясвіжскага раёна) Мікалай Мікалаевіч Андросік, беларускі вучоны ў галіне ветэрынарнай мікрабіялогіі і эпізааталогіі, акадэмік Акадэміі аграрных навук Беларусі, доктар ветэрынарных навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па дыягностыцы, спецыфічнай прафілактыцы і мерах барацьбы з інфекцыйнымі хваробамі жывёл. Абгрунтаваў і распрацаваў новы накірунак па вывучэнні малавядомых хвароб жывёл.

Было сказана

Максім БАГДАНОВІЧ, паэт, перакладчык, публіцыст:

«Няўмольна хутка круціцца і не ведае супачыну кола жыцця».

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка Травой заросшая крынічка». Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Ірына ТАМКОВІЧ

Расліны, якія робяць дабратворны ўплыў на мікраклімат памяшканняў

Як сцвярджаюць спецыялісты, лісце хларафітума акумулюе шкодныя для здароўя чалавека і жывёл злучэнні серы, азоту і фармальдэгіды, якія ўтвараюцца, у прыватнасці, пры спальванні бытавага газу. Таму рэкамендуецца размяшчаць хларафітум на кухні, дзе ёсць газавая пліта. Гэта непераборлівая расліна, здольная нейтралізаваць шкодныя і нават атрутныя рэчывы ў паветры памяшканняў, адыграе неацэнную ролю і пасля рамонту. Хларафітум — адна з самых карысных пакаёвых раслін. Для ачышчэння паветра пакоя плошчай 18—20 кв. м неабходна не менш за 6 раслін, якія можна размяшчаць у скрынках. Дарэчы, шмат такіх скрынак абцяжарыць прыбіранне памяшкання.

Герань.

Герань (пеларгонія) выконвае ролю своеасаблівага пакаёвага доктара пры анкалогіі, захворваннях нервовай сістэмы, асабліва пры функцыянальных яе расстройствах, неўрозах рознай этыялогіі, пры бяссонніцы. Галоўны дзейсны кампанент герані — гераніёл. Ён валодае антыбактэрыяльнай і антывіруснай актыўнасцю.

У хатніх лімонаў гаючую сілу маюць не толькі плады, але і духмянае лісце. Яно змяшчае 85 розных гаючых рэчываў. У памяшканні, дзе знаходзяцца лімоны, паветра амаль стэрыльнае. Калі ў пакоі будзе расці лімон, то шматлікія хваробатворныя мікробы, якія ёсць у гэтым пакоі, страцяць здольнасць размнажвацца.

Каланхоэ.

Антымікробнымі ўласцівасцямі валодаюць таксама брызгліна, мірт. Каланхоэ і эўкаліпт здольныя папярэдзіць развіццё прастудных захворванняў. Асабліва гэта актуальна ў халодную пару года. Група з 4—5 такіх раслін валодае антымікробным дзеяннем на адлегласці 1,5—2 м. Чысцяць наша жыллё філадэндран, плюшч звычайны, іглічныя, карлікавы фікус, бягонія. Склаўшы кампазіцыі з фітанцыдных раслін, можна захаваць і ўмацаваць здароўе, пазбавіцца ад стрэсавых станаў і павялічыць працаздольнасць.

У зачыненых памяшканнях можна выкарыстоўваць размарын лекавы, фітанцыды якога паказаны пры лячэнні хранічнага бранхіту, эмфізэмы лёгкіх, катару верхніх дыхальных шляхоў, бранхіяльнай астмы і іншых хвароб. Лаўр высакародны дапамагае пры спастычных станах (ангіяспазмах), спазмах кішэчніка і жоўцевыводных шляхоў.

Калі вы жадаеце, каб фітакампазіцыя аказвала агульнае аздараўленчае ўздзеянне і чысціла паветра ад патагенных мікробаў, то выкарыстоўвайце арыгінальнае спалучэнне альяса дрэвападобнага ці каланхоэ пёрыстага з рознымі формамі хларафітума.

ВАЖНА! Пры тэмпературы больш 25°С расліны паглынаюць газ у два разы інтэнсіўней, чым пры 13°С.

ВАЖНА! Драўняныя расліны ажыццяўляюць газаабмен у 3-10 разоў інтэнсіўней, чым травяністыя.

Як прымусіць фіялку цвісці?

Перасаджваем фіялку ў свежую друзлую глебу, пры неабходнасці ў меншы вазон. Падчас перасадкі абарвіце ўвесь ніжні рад лісця. Не бойцеся: фіялка спакойна перажыве страту 4—5 лісцікаў. Перастаўляем фіялку бліжэй да святла. Калі перад акном, што выходзіць на поўдзень, расце высокае дрэва, можна ставіць нашу кветку на падаконнік: крона дрэва рассее святло і фіялка не атрымае апёкаў. Калі акно добра асветлена, яго можна злёгку зацяніць.

Сочым за вільготнасцю паветра. Тут усе спосабы добрыя, але ўвільгатняльнік, мабыць, самы зручны. А калі фіялак будзе досыць шмат, яны і самі будуць ствараць спрыяльны мікраклімат.

Праз пару тыдняў пасля перасадкі пачынаем падкормліваць фіялку ўгнаеннем з павышанай колькасцю фосфару. Можна паспрабаваць любое ўгнаенне для раслін, якія цвітуць, — толькі паменшыўшы канцэнтрацыю ў 2—3 разы. Фіялкі добра закладваюць кветканосы ў прахалодзе. Хаця б на нейкі час адносьце яе на ноч у самае прахалоднае месца ў доме. Вельмі добра калі там будзе градусаў 15—16. Толькі, калі яна прывыкла да «тропікаў», змяншайце тэмпературу паступова.

Праз месяц зноў абарвіце ніжні рад лісця. Вельмі часта фіялка пачынае цвісці пасля страты большай часткі лісця. Калі вы паспрабавалі ўжо ўсё, што можна, а фіялка не цвіце, напужайце яе смеццевым вядром. Трохі «нерацыянальна», але часам дапамагае. Калі душа паўстае супраць такога гвалту, можна паспрабаваць мякчэйшы спосаб — пахваліць «прылюдна» фіялачку, якая зацвіла. А калі ўжо і гэтыя меры не дапамаглі — аддайце фіялку каму-небудзь: мабыць, змена клімату пойдзе ёй на карысць.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	— 9.25	17.09	7.44
Віцебск	— 9.22	16.51	7.30
Магілёў	— 9.15	16.59	7.44
Гомель	— 9.04	17.03	8.00
Гродна	— 9.39	17.25	7.47
Брэст	— 9.32	17.34	8.02

Месяц

Першая квадра 8 студзеня. Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

***Пр.** Сцяпана, Фёдара.*

***К.** Аліцыі, Тэрэзы, Адрыяна, Антонія, Юльяна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



...у суседзяў

ВАРШАВА	+5..+7°С
ВІЛЬНЮС	+4..+6°С
КІЕЎ	+5..+7°С
МАСКВА	0..+2°С
РЫГА	+4..+6°С
С.-ПЕЦЯРБУРГ	0..+2°С

УСМІХНЕМСЯ

Стадыі навагодняга карпаратыву:

1. Урачыстая прамова шэфа з віншаваннямі пад бурныя апладысменты.
2. Праглядаюцца мужчынскія і жаночыя кампаніі.
3. Усё перамяшалася.
4. Выклік таксі з мэтай куплі дадатковага спіртнога.
5. Разбіліся па парах.
6. Прыбыццё (раніцай) жонак і мужоў у пошуках сваіх законных палавін. Не выключаны мардабой!

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 22.733. Індэкс 63850. Зак. № 131.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 8 студзеня 2014 года.